# УСЕНАРОДНЫ ПОГЛЯД НА БЯСПЕКУ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Аб тым, што ваенна-палітычная сітуацыя ў рэгіёне, ды і ў свеце ў цэлым, ацэньваецца палітыкамі-экспертамі як крызісная з перадумовамі пераходу ў фазу глабальнага канфлікту, вы не раз чулі. Сёння пагаворым аб тым, якімі сіламі і сродкамі нагнятаюцца пагрозы нашай нацыянальнай бяспецы.

Асноўную рэальную рызыку стварае гарачы пункт у рэгіёне — вядома ж, Украіна. Вашынгтон робіць усё, каб уцягнуць у канфлікт нашу краіну. Запусціць механізм уцягвання астатніх дзяржаў — гэта значыць аслабіць Заходне-, і Усходне-Еўрапейскі рэгіёны.

Што датычыцца Украіны, вы шмат пра гэта ведаеце, і я звяртаўся да гэтага пытання неаднойчы, тым не менш два словы аб сітуацыі на сёння на самім фронце.

Ідуць цяжкія баі. На жаль, гінуць людзі, і гэта ўжо не адзінкі, дзясяткі і сотні, а тысячы людзей. Ва ўкраінскіх войсках склаўся сур'ёзны дэфіцыт не толькі боепрыпасаў, пра якія шмат гаварылі, вельмі моцна перажывалі, як я кажу, парыліся наконт выдзялення 60 мільярдаў долараў на гэтую вайну. Тады я вас папярэджваў, што грошы дадуць, зразумела. Таму што не даць гэтыя грошы — упусціць магчымасць апусціць нас і Расію разам узятых і аслабіць нас.

Таму боепрыпасы паставяць, ракеты і іншае, аб гэтым ніжэй. Але не хапае людзей. Людзі ўцякаюць ад вайны. Гэта недурныя людзі, гэта нашы людзі, мудрыя, талковыя.

Выдзяленне Злучанымі Штатамі Амерыкі 60 мільярдаў долараў на вайну — найважнейшы фактар эскалацыі канфлікту ва Украіне. І вельмі небяспечна, што былі выдзелены ракеты далёкага дзеяння ATACMS.

Удары БПЛА па Расійскай Федэрацыі (вы ведаеце, НПЗ, аэрадромы), уплывовыя людзі, якія пастаўленыя, як у бандытаў кажуць, на лічыльнік — усё гэта планы (і не планы, а дзеянні ўкраінцаў), якія сведчаць аб тым, што адбываецца эскалацыя вайны.

У той жа час армія Расійскай Федэрацыі абсталявана новай зброяй. Рэзервы маюцца ў кожнай брыгадзе.

На апошніх перагаворах у Крамлі, калі мы іх вялі з Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным, ён запрасіў кіраўніцтва Генеральнага штаба і сілавых структур, і мы ўдваіх проста паслухалі інфармацыю аб тым, што адбываецца на фронце. І мяне вельмі пераканала і здзівіла збольшага інфармацыя, якую далажыў начальнік Генштаба Расіі, аб тым, што яны стварылі дастатковыя рэзервы ў жывой сіле і тэхніцы. Сёння на фронце кожная расійская брыгада (іх нямала) мае рэзервы як мінімум у выглядзе палка. Гэта значыць, калі стаіць на фронце брыгада, у тыле ў яе разгорнуты полк, узброены самай сучаснай зброяй.

Што да самога фронту, ідуць вельмі сур'ёзныя баі, як я сказаў. Расія павольна, 500 метраў, кіламетр, два, тры (на розных участках па-рознаму), але кожны дзень, кожныя суткі прасоўваецца наперад. Вы ведаеце інфармацыю аб




Фота БелТА

вызваленні расійскімі войскамі некаторых населеных пунктаў. Але гэта вельмі марудная прасоўванне.

Утварыўся, як у нас у народзе кажуць, нейкі цугцванг: ні яны, украінцы, ні расіяне. Так, рух ёсць, але не той рух, які хацелася б мець. Патавая сітуацыя. Што ў гэтай сітуацыі, як я разумею і заўсёды прапаную, трэба было б зрабіць? Самая сур'ёзная, як ніколі за гэту вайну, і зручная, калі можна так выказацца, сітуацыя для міру, для заключэння мірнага дагавора. Калі я быў у Маскве, выказаў сваю пазіцыю журналістам, калі яны ў мяне спыталі, як дзейнічаць.

Але для пачатку перапыненых перагавораў заўсёды іх трэба пачынаць з чагосьці, можна было б пачаць са Стамбульскіх пагадненняў, пра якія гаворыць прэзідэнт Пуцін часта. Ён мне пасля таго, як яны ў Стамбуле былі выпрацаваны, перадаў іх, я яшчэ раз паглядзеў — цалкам нармальныя пагадненні. Гэта не значыць, што ў выніку перагавораў будуць прынятыя або пакладзены нават у аснову мірнага дагавора гэтыя парафіраваныя бакамі пагадненні. Не. Але з іх можна пачынаць і рухацца наперад. Вядома, гэта не будзе мірны дагавор, копіі гэтых пагадненняў. Мірны дагавор будзе іншы. Але з гэтага можна пачынаць. Пра гэта ж дамаўляліся, доўга выпрацоўвалі (у нас тры раўнды і ў Стамбуле раўнд перагавораў), да чаго прыйшлі.

Я ўжо казаў учора, усе вайскоўцы, кіраўнікі спецслужбаў Захаду, палітыкі, кіраўнікі дзяржаў, і ўжо публічна кажуць пра тое: «Нельга дапусціць перамогі Пуціна». Ну, калі вы на гэтым настойваеце, што гэта нельга, дык гэта момант для перагавораў. Як я кажу, згуляйце ўнічыю на гэтым этапе. Не трэба прапаноўваць радыкальных рашэнняў, як «формула Валодзі Зяленскага». Ну, падобна, патрыятычная і гэтак далей, але яна нерэальная. Яна сёння нерэальная! Расіяне сёння не сыдуць ні з Крыма, ні з усходніх рэгіёнаў, як яны называюць, Наваросіі. Яны не сыдуць! Ведаеце, чаму.

Таму, калі вылучаюцца непрымальныя да перагавораў прапановы, — гэта значыць, што той бок, які іх прапаноўвае, не гатовы ісці на перагаворы.

Я ведаю настроі ваенных украінскіх: ім ужо гэтая вайна надакучыла. Але і яны не могуць распачаць самастойныя дзеянні, таму што за прэзідэнтам Зяленскім, які хоча ваяваць «да апошняга ўкраінца», стаяць цэлыя войскі НАТА, і ўвесь заходнееўрапейскі блок, і Злучаныя Штаты Амерыкі. Сітуацыя вельмі сур'ёзная. Але, калі цяпер, на маю думку, не пайсці на перагаворы, Украіна з цягам часу страціць і сваю дзяржаўнасць і можа спыніць сваё існаванне.

Ведаю, што вось пасля гэтых маіх размоў, ва Украіне падымецца зноў шум, мяне пачнуць дзяўбаць па ўсіх гэтых каналах розныя блогеры і журналісты, але я ўжо да гэтага прывык. Я выказваю сваю пазіцыю. Сваю! І, калі вы з ёй згодны, я прашу зыходзіць з гэтага: ва Украіне сёння патрэбен мір. Сведчаннем таму з'яўляюцца ўцёкі больш-менш здаровых, разумных украінцаў з краіны, каб не трапіць на фронт.

Мы ж добра ведаем, што іх хапаюць на вуліцах і часцяком нават не навучаюць, не праводзяць баявое зладжванне на палігонах. Іх кідаюць прама на фронт, і не ў другім эшалоне, а як штурмавікоў, а ззаду СМЕРШ, атрады ўзброеных людзей-украінцаў, якія ідуць следам за гэтымі небаракамі. Як яны часта кажуць, цытую: «Нам выдалі білет у адзін бок». Мы ж ведаем, пра што яны гавораць на фронце, у нас там сур'ёзная пазіцыя.

Ніхто сёння не жадае ваяваць, таму трэба ісці да міру!

Але вобраз ворага ў асобе Масквы і Мінска амерыканцам удалося сфарміраваць. Вашынгтон паступова прасоўвае агрэсіўныя наратывы ў адрас беларускай і расійскай дзяржаў, павышаючы градус варожасці блока НАТА на нашым напрамку.

Пашырэннем Паўночнаатлантычнага саюза, які прыняў у склад Фінляндыю і Швецыю, Вашынгтон і Брусель працягваюць фарміраваць вакол Расійскай Федэрацыі пояс недружалюбных дзяржаў. На чарзе ўступлення ў альянс — іншыя краіны Еўропы. Мэта вядомая: па задуме, на гэтай лініі ўсё павінна палаць.

Яшчэ раз прашу вас звярнуць увагу на мой тэзіс, выказаны ўчора. У народа заўсёды пытанне: ну а чаго жадаюць гэтыя западэнцы і амерыканцы? Яшчэ раз паўтараю: яны проста хочуць утапіць Расію ў вайне, адарваць яе ад саюза з Кітаем, які намеціўся. Гэтага саюза няма, але ён намячаецца. Абставіны склаліся так, што і Расіі, і Кітаю трэба быць разам. Амерыканцы гэта зразумелі, ім трэба ўбіць клін. Ну, гэта правільна. Як утапіць? Ва Украіне. Таму 60 мільярдаў долараў — для іх гэта не грошы: ваюйце, забівайце адзін аднаго.

Але я хачу, учора я не дагаварыў, мець на ўвазе яшчэ адну рэч. Для амерыканцаў Кітай і Расія — гэта яшчэ не ўсе сапернікі і ворагі. Для самой Амерыкі, мы гэта адчулі ў часы Трампа, вельмі сур'ёзным сапернікам з'яўляецца сама Еўропа, Еўрапейскі саюз, асабліва з тых часоў, калі ў альтэрнатыву долару Еўропа адважылася (стала нахабнай!) і ўвяла еўра. Гэта моцная валюта. Таму амерыканцам ніякія сапернікі і канкурэнты не патрэбны. Таму, утапіўшы Расію ў вайне ва Украіне, нагрузіўшы Еўрапейскі саюз гэтай вайной (давайце па два, па тры працэнты ад ВУП выкладвайце, вырабляйце больш зброі і боепрыпасаў, пасылайце супраць Расіі на фронт, а то ўжо і сваіх людзей). Я хачу, каб вы разумелі: там даўно ваююць натаўскія найміты!

Месяц таму расіяне нанеслі, проста для інфармацыі вам, найсур'ёзнейшы ўдар па пазіцыях баевікоў на ўкраінскай тэрыторыі. Загінулі дзясяткі палякаў. Вы што-небудзь чулі пра гэта? Палякаў дзясяткі загінулі, не адзін, не два, не тры чалавекі, трапілі пад агонь Расійскай Федэрацыі! Труны і трупы вывозіліся ў Польшчу. Чаму ўрад Польшчы не праінфармаваў польскае насельніцтва?

Таму амерыканцы хочуць забіць некалькі зайцоў адразу: аслабіць Расію, перагрузіўшы Еўропу, аслабіць яе ў тым ліку. Ну, а там, на Ціхім акіяне, як я казаў, разбірацца сам-насам з Кітаем, уцягваючы ў гэтую бойку перш за ўсё Індыю, ну Англію там, Аўстралію, дай бог Украіну і Паўднёвую Карэю. Супраць Кітая.

А нам трэба разумець, што сітуацыя патрабуе вельмі жорсткага кантролю ва ўсіх сферах: пачынаючы з інфармацыйнай і заканчваючы ваеннай. Любое неасцярожнае слова, рух — можа пачацца адкрытае ўзброенае супрацьстаянне, аж да прымянення ядзернай зброі.

Я і кажу, што вось пастаўка дальнабойных ракет без умоў. Раней яны пастаўлялі і публічна хаця б заяўлялі, што яны забаранілі ўкраінцам наносіць удары па тэрыторыі Расіі, збольшага і Беларусі, а цяпер яны ўжо не абумоўліваюць пастаўкі ATACMS і іншых дальнабойных боепрыпасаў. І калі сітуацыя складзецца пагрозліва, перш за ўсё яны хочуць для ўнутранай сітуацыі ў Расіі, Расія прыменіць увесь арсенал, якім яна валодае. Гэта будзе апакаліпсіс! Для гэтага ўсё гатова.

НАТА, вядома, з падачы Штатаў настойліва дэкларуе неабходнасць інтэнсіўнай мілітарызацыі Еўропы. І размова не ідзе аб абароне, аб адбіцці нейкай агрэсіі. Каб вы разумелі: робіцца акцэнт на нарошч-